

ЦІ МОЖНА ПАХУДЗЕЦЬ НА ПЕЛЬМЕНЯХ І КЛЁЦКАХ? 8

ЗАХАВАЛЬНІЦА ДУХОЎНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 МАЯ 2023 г. АЎТОРАК № 101 (29981)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, дзяржсакратар Савета бяспекі:**

*«Краіну павінны абараняць усе, не толькі ваенныя. Людзі паведамляюць неадкладна аб з'яўленні незнаёмцаў, тэхнікі ў тым ці іншым населеным пункце, вёсцы. А да вучэнняў па адпрацоўцы, затрыманні дывер-сійна-разведвальных груп, спыненні дзеянняў незаконных узброеных фарміраванняў мясцовае насельніцтва ставіцца з разуменнем. Ніякага абурэння ў гэтым кірунку не было. І новы ўказ, думаю, у найбліжэйшы час выйдзе ўжо ў свет — аб народным апалчэнні. Палажэнні ўказа праходзяць апрабацыю ўжо на практыцы».*

# «ГОМСЕЛЬМАШ» ЯК ЛЁС




Сярод 14-тысячнага калектыву гомельскіх камбайнабудаўнікоў ёсць нямала працоўных дынастый, калі дзеці і ўнукі працягваюць справу сваіх бацькоў. Агульны стаж работы на ААТ «Гомсельмаш» працоўнай дынастыі Гуляевых — Кульбакавых — Кісялёвых складае 450 гадоў, а многія з 20 членаў сямейнай дынастыі да гэтага часу працягваюць працаваць на прадпрыемстве.

**БелТА.**

## КОРАТКА

- **Беларуска Марына Васілеўская прызначаная ў асноўны экіпаж для палёту на МКС.**
- Міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Алейнік 30—31 мая наведае з афіцыйным візітам Пакістан.
- **Забароны і абмежаванні на наведванне лясоў уведзены ва ўсіх раёнах Беларусі.**
- Беларускія ратавальнікі прыбылі ў Стамбул для дапамогі ў тушэнні пажараў.
- **Ашуканцы пачалі рассылаць шкодасныя лісты ад імя «Белпошты».**
- Больш за 50 неэксплу-таваных будынкаў знеслі ў Гомельскай вобласці ў студзені—красавіку.

Навакольнае асяроддзе

## КАБ НЕ ЗАГРАЗНУЦЬ У СМЕЦЦІ

### Ці ўсё залежыць ад перапрацоўкі ў справе абясшкоджвання бытавых адходаў?

**Мінулым летам з сумнай нагоды давялося быць на сталічных могілках «Міханавічы». На адным з участкаў мяне ўразіў «стог» з вянкоў і кветак. Па ўсім відаць, што ўтрамбаваная рознакаляровая гурба не адзін дзень рыхтавалася да вывазу. Па форме яна нагадвала сцірту саломы, што ставяць на калгасных палетках, а вось па велічыні выглядала на чатыры, калі не болей, такія сцірты. Гэта ж колькі ядавітага смецця, менавіта ядавітага, афарбаванага з прымяненнем таксічных аналінавых рэчываў, можа трапіць у зямлю толькі з адных могілак! — падумалася тады.**

Традыцыя літаральна завальваць вясной месцы спачыну яркімі штучнымі кветкамі мяне даўно абурае. Могілкі, якія, паводле вызначэння, з'яўляюцца месцам роздуму, памяці, смутку, стараннямі родзічаў памерлых выглядаюць у нас часам нібы мексіканскія карнавалы. Амаль нідзе ў свеце няма такой моды, вось толькі ў нас яна прыжылася не без дапамогі вытворцаў і гандляроў таннага шырспажыву. СТАР. 7

Эх, лета!

## АДПАЧЫНАК З КАРЫСЦЮ: ВАРЫЯНТЫ — НА РОЗНЫ ГУСТ...

### Як правільна распарадзіцца канікулярным часам?

**Пятай вучэбнай чвэрцю называюць летнія канікулы паміж сабой прадстаўнікі сістэмы адукацыі. І гэта зусім невыпадкова, бо па насычанасці, змесце і тэмпе работы тры летнія месяцы мала адрозніваюцца ад навучальнага года.** СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X

звязда
Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!